ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

ПАГОНЯ

№ 30 (129) 11 -17 жніўня 1995 г. Кошт 600 рублёў

НАЗАД У "СЬВЕТЛУЮ БУДУЧЫНЮ" - ст. 2.

НЕБЯСЬПЕЧНЫ ГРУЗ ПАЕХАЎ У СТАЛІЦУ - ст. 3.

ВОЙНЫ СПРАДЖАЮЦЬ ІМПЕРЫІ - ст. 4.

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ НА ТЫДЗЕНЬ: Менск - Варшава - Масква - Санкт-Пецярбург.

ВЕЧАРЫНА, ПРЫСЬВЕЧАНАЯ Л.ГЕНІЮШ, УСЁ Ж АДБЫЛАСЯ

9 жніўня ў Горадні адбылася вечарына, прысьвечаная 85-м угодкам з Дня нараджэньня Ларысы Геніюш. Планавалася яе правесьці ў Кабінеце гісторыі сярэдняй школы N 8. Але камусьці, відаць, вельмі хацелася перашкодзіць яе правядзеньню, бо перад пачаткам вечарыны невядома куды зьніклі ключы ад кабінета. Аднак імпрэза ўсё роўна адбылася ў памяшканьні бібліятэкі факультэта беларускай філалогіі і культуры Гарадзенскага дзяржуніверсітэту.

На вечарыне шмат гаварылася пра жыцьцёвы і творчы шлях Ларысы Геніюш, пра выпрабаваньні, якія выпалі на яе долю, пра вялікую любоў яе да беларускага народа, мару бачыць Беларусь незалежнай, квітнеючай. Прагучалі на імпрэзе і ўспаміны тых, каго лёс зьвёў з Ларысай Антонаўнай, вершы славутай паэткі і творы, прысьвечаныя ёй.

Завяршылася вечарына нацыянальным беларускім гімнам «Магутны Божа» у выкананьні хора «Бацькаўшчына» і ўдзельнікаў імпрэзы.

Д.Г.

ЭКСПАРТ ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

У Гарадзенскай вобласьці падведзены вынікі зьнешнеэканамічнай дзейнасьці прамысловых прадпрыемстваў за 6 месяцаў бягучага года.

Агульны аб'ём абарота па экспарту ў краіны далёкага замежжа дасягнуў амаль 100 млн. долараў - гэта больш, чым за ўвесь мінулы год. Акрамя таго, у краіны блізкага замежжа накіравана прадукцыі на 74 млн.долараў. На сёньняшні дзень у вобласьці экспартуюць сваю прадукцыю 37 прамысловых прадпрыемстваў.

Як паведаміў намесьнік старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму М.Бяляеў, лідыруе ў сьпісе краін, у якія экспартуецца прадукцыя, Расея. На другім месцы - Германія, на трэцім - Нідэрланды, затым ідуць Латвія, Польшча, Летува. Сярод гарадзенскіх прадпрыемстваў-экспарцёраў найбольш пасьпяхова працуюць ВА «Азот» і ВА «Хімвалакно» і аб'яднаньне «Лакафарба» з Ліды.

СІМ

ЗА СПРАВУ АДРАДЖЭНЬНЯ БЯРЭЦЦА МОЛАДЗЬ

У Горадні створаны аргкамітэт па ўтварэньню Маладзёжнага Нацыянальнага Руху, які будзе дзейнічаць пакуль як Маладзёжная фракцыя БНФ.

9 жніўня ў памяшканьні КАФ «Бацькаўшчына» адбылося першае яго паседжаньне. На ім адзначалася, што маладзёжная арганізацыя ствараецца з мэтай станаўленьня беларускай дзяржавы праз пашырэньне нацыянальнай ідэі ў маладзёжным асяродку. У вырашэньні сваіх задач яна будзе супрацоўнічаць з усімі, хто падтрымлівае ідэю пабудовы моцнай беларускай дзяржавы. Мяркуецца, што асноўнымі накірункамі яе дзейнасьці стануць наладжваньне сувязяў і ўзаемадзеяньня з іншымі маладзёжнымі арганізацыямі патрыятычнага накірунку дзеля каардынацыі дзеяньняў і правядзеньня сумесных акцый, стварэньне банку дадзеных маладзёжных арганізацый, падтрымка ініцыятываў моладзі, якія адпавядаюць мэтам маладзёжнай фракцыі, праца па абуджэньню нацыянальнай сьвядомасьці ў маладзёжным асяродку.

Старшынёй аргкамітэту абраны студэнт шостага курса біялагічнага факультэта Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэту Ігар Лапеха. Наступнае паседжаньне адбудзецца ў канцы жніўня - пачатку верасьня.

Д.Г.

ДАМОЎ НА МЭРСЭДЭСЕ

У швецкім Гётэборгу набліжаецца да завяршэньня чэмпіянат сьвету па лёгкай атлетыцы. Пасьпяховым трэба прызнаць выступ на ім зборнай Беларусі ў складзе якой нямала «зорак» «каралевы спорту».

Першы медаль у скарбонку краіны прынёс Яўген Місюля (дарэчы, выхаванец Сьвіслачы) у хадзе на 20 км. Ён фінішаваў 4-м, але ўсё ж атрымаў «бронзу», дзякуючы таму, што італьянскі спартсмэн быў дыскваліфікаваны. Апошні на фінішы «зблытаў» хаду з бегам. Дваістыя пачуцьці пакінула 2-е месца ў кіданьні молата Ігара Астапковіча. Для краіны - гэта несумненны посьпех, для гарадзенскага асілка - адносная няўдача. На жаль, у найбольш прэстыжных выпрабаваньнях Астапковіч заслужыў рэпутацыю «вечна другога». Яшчэ адзін срэбны медаль здабыў Эдуард Хямяляйнен у дзесяцібор'і. Эдуард, як асоба, сфармаваўся ў Горадні, зараз жыве і трэніруецца ў Фінляндыі, але па-ранейшаму бароніць гонар Беларусі. А на чацьвёрты дзень спаборніцтваў мы дачакаліся і «золата». У кіданьні кап'я роўных не знайшлося Натальлі Шыкаленка. Гэта выявілася ўжо ў кваліфікацыі, а ў фінале фаварытка пацьвердзіла сваю несумненную перавагу.

Дахаты Натальля выправіцца на прэстыжным «Мэрсэдэсе» - пераможцы ўзнагароджваюцца аўтамабілем навейшай мадыфікацыі.

Апагеем рысталішча сталіся мужчынскія скачкі трайным. Беласкуры атлет з Англіі Джанатан Эдвардс шакіраваў і скарыў сьвет фантастычнымі скачкамі за 18 метраў - сьпярша 18 м 16 см, а пасьля ўвогуле «касьмічны» вынік - 18.29. Здаецца, мяжы фізічных магчымасьцяў чалавека сапраўды няма. Як няма мяжы і «бэсэсэраўскай» дурасьці. Калі напачатку прадстаўнікі Беларусі выходзілі пад бел-чырвона-белым сьцягам, то ўжо пад час выступу Шыкаленкі «сьвяціўся» чырвона-зялёны.

Хельмут КАМЕНСКІ

ЗЯЛЁНЫ ПАРАСТАК МІЛІЦЫІ

Трывожная санітарна эпідэміялагічная абстаноўка побач з многімі прадпрыемствамі Берасьця ды ў некаторых гандлёвых кропках горада запатрабавала стварэньня экалагічнае міліцыі.

Ужо зроблена эканамічнае абгрунтаваньне гэтага новаўвядзеньня. Калі будзе вынесенае станоўчае рашэньне, пачнецца стварэньне адпаведных структураў.

Алесь САЛОДКІ

КСЯНДЗА АШТРАФАВАЛІ

У Нясьвіжы за пражываньне без прапіскі аштрафаваны ксёндз-місіянер, які прыехаў з Польшчы. Яму давялося выплаціць 600 тысяч рублёў.

Відавочна, што гэта зьвязана з адбыўшымся візітам на Беларусь Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II. Бо пасьля гэтага ўлады пачалі інакш ставіцца да неправаслаўных сьвятароў і прапаведнікаў.

Вацлаў СЯРПІНСКІ.

СКАНДАЛ!

ЯК СЬПЕЦСЛУЖБА ШЧУЧЫН ПАЛОХАЛА

Усё было, як у "крутым" замежным баевіку. 2 жніўня пасьля абеду на тэрыторыю завода «Аўтапровад», дзе ішла разгрузка суперМАЗаў з адкідамі медзі і алюмінія, з шумам уварваліся малойчыкі ў чорных масках. Пагражаючы зброяй, прымяняючы сьпецсродкі, яны ставілі да сьцяны рабочых, прымушалі ляжаць ніцма на зямлі, білі, абшуквалі...

Паніка і страх паралізавалі завод. Больш 200 чалавек пакінулі свае працоўныя месцы. Дырэктар завода тэрмінова зьвязаўся са Шчучынскай міліцыяй і паведаміў, што на тэрыторыю завода пранiклі невядомыя асобы з агнестрэльнай зброяй, якія прымяняюць фізічную сілу, перашкаджаюць працаваць.

На месца здарэньня выехаў нарад мясцовай міліцыі. Работнікі РАУС на свае вочы пераканаліся ў дзікунскай сітуацыі, калі ад «караючай рукі» людзей у масках даставалася зусім выпадковым, ні ў чым не вінаватым людзям.

Нашым міліцыянерам давялося вырашаць канфлікт, супакойваць справядліва абураных, перапалоханых людзей, разьбірацца ў сітуацыі.

Аказваецца, гэтак «гучна» супрацоўнікі сьпецслужбы КДБ па Менску і Менскай вобласьці «бралі» вадзіцеляў суперМАЗаў, якіх «вялі» ад самае сталіцы.

«Але навошта ж столькі шуму? - паціскаюць плячыма кіраўнікі і рабочыя завода. - Няўжо нельга было ўсё зрабіць ціха, спакойна, кваліфікавана, без маральных траўм?»

Здагадацца, навошта гэты шум, лёгка. Нам усім далі яшчэ адзін урок. Нагадалі тым, хто забыўся, чаго вартыя правы, здароўе і годнасьць простага чалавека. А яшчэ - што трэба баяцца. Баяцца тых, у каго сіла, зброя, улада. Бо цяпер іх час.

Таму «гуляюць» дубінкі па сьпінах дэпутатаў, студэнтаў, рабочых, таму парушаюцца правы чалавека і законы. Гэткім чынам адпрацоўваюцца вялізныя грошы, якія ўрад плоціць сваім «асабліва давераным людзям».

А напрыканцы прывяду яшчэ некалькіх цікавых фактаў аб гасьцях са сталіцы, з якімі давялося сутыкнуцца шчучынцам. 1 жніўня (гэта значыць, напярэдадні аперацыі на «Аўтапровадзе») супрацоўнікі Шчучынскай міліцыі затрымалі ВАЗ-21053, у якім «інкогніта» каталіся па горадзе нецьвярозыя супрацоўнікі сьпецслужбы КДБ па Менску і Менскай вобласьці.

А назаўтра, пасьля «атакі» завода, непадалёк ад вёскі Цыбары Лідзкага раёну ВАЗ-21053 выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтамашынай, вадзіцель якой загінуў. У «Жыгулях», як вы здагадаліся, ехалі сьпецслужбаўцы, якія добра «адсьвяткавалі» завяршэньне справы...

Ала БІБІКАВА.

ф.сп-1

Міністэрства сувязі Беларусі
"Белсаюздрук"

АБАНЭМЭНТ на газэту 63124

ПАГОНЯ

Колькасьць камплектаў: 1

на 1995 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	X	X	X

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ	Месца	літар

на газэту 63124

ПАГОНЯ

Кошт	падпіскі	9000 руб.	Колькасьць камплектаў	1
	пера-адрасоўкі	руб.		

на 1995 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	X	X	X

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

ПРЫЙШОЎ ЧАС ХІТРЫХ І НЕСУМЛЕННЫХ?

Нехта разумны вельмі трапна сказаў: «Кожнае наступнае пакаленьне горшае за папярэдняе».

Вось дык сказаў. Сказаў і ўсё пераблытаў.

Задумайцеся толькі: мы горшыя за сваіх бацькоў, а нашы дзеці будуць горшымі за нас. А як жа тады з такім філасоўскім паняткам, як наватарства? Чаго там больш, калі кожнае наступнае пакаленьне горшае? Можа таму цяжка захаваць лепшыя традыцыі?!

Пры пераемнасьці пакаленьняў чамусьці ўсё горшае прымаецца без мэтанакіраваных адпаведных захадаў. У той час, калі «разумнаму, добраму, вечнаму» трэба вучыць і вучыць. Не хацелася б абвінавачваць цывілізацыю ў такім пагаршэньні, але ў народзе кажуць: «І падкінуў д'ябал кола чалавеку і... пакацілася ўсё да чортавай маццеры!». Але ж «І стварыў Бог чалавека па свайму вобразу і падабенству...». Уяўляеце, якая дасканаласьць была?!

Дык, што ж тады здарылася? Няўжо гэту дасканаласьць змог спакусіць нейкі паўзучы гад? У некаторых народаў (гл.Дж.Дж.Фрэзер. "Фольклор в Ветхом Завете".) ёсьць свая думка наконт усяго гэтага: калі Бог вылепіў чалавека з гліны, падняўся на неба за душой. У гэты час Д'ябал так абпляваў і загадзіў цела, што Богу нічога не заставалася, як толькі вывернуць яго навыварат. Вось гэта ўявіць можна.

Як бы там не было, але Чалавек ва ўсе часы сам рабіў выбар, што перадаць сваім нашчадкам, а што не, каб яно было альбо лепшым, альбо горшым: ці боскую дасканаласьць, ці д'ябальскія нечыстоты. Гэта выпрабаваньне на чалавечнасьць нідзе так не вызначалася яскрава, як у асяродку тых, хто быў пры ўладзе.

Менавіта яны павінны былі адпавядаць свайму высокаму прызначэньню і быць прыкладам для астатніх. Бо ўсякая ўлада ад Бога. Але метады і прыёмы праяўленьня ўлады належаць чалавеку (на тое і была дадзена воля). А чалавек, як вядома, істота зямная - можа быць спакушаны Д'яблам. А спакуса ўладай - гэта самая вялікая спакуса. Ня ўсякаму спакушанаму ўдавалася зьберагчы ў сябе боскасьць і чалавечнасьць.

Калі б гутарка ішла пра выміраньне такіх тыпаў, то гэта можна было бы толькі вітаць, але мы гаворым пра пераемнасьць пакаленьняў, перадачу досьведу і традыцый. Давайце згадаем нядаўнюю жорсткую цэнтралізацыю ўлады, пры якой кіраўнікі ўсіх рангаў выконвалі функцыі перадатчыкаў інфармацыі ад вышэй да ніжэйстаячых органаў. Такім макарам праводзіўся і кантроль за выкананьнем. Давайце пагадзімся з тым, што быць такім перадатчыкам ці трансьлятарам, ці нават кантралёрам значна лягчэй, чым быць ініцыятарам альбо выканаўцам той ці іншай справы.

Калі тыя, хто быў пры ўладзе, маглі абысьціся без сваёй высокай прафесійнай падрыхтоўкі і таленту, то прагрэсіўным добрым выканаўцам ці кіраўніком бяз гэтых якасьцяў ня станеш. Але парадокс сістэмы і быў у тым, што першыя рэгулявалі і кантралявалі дзейнасьць другіх, больш таленавітых і прагрэсіўных. Тым, хто быў пры ўладзе, патрэбны былі масы праставатага, пакорлівага, працавітага і сумленнага люду. Пры тым сумленьне тут трэба разглядаць не як крытэрый чалавечнасьці ў чалавеку, а як разуменьне партыйнай і службовай адказнасьці.

Асоба, якая не магла ўпісацца ў такія штучна створаныя рамкі для сваёй дзейнасьці, была незразумелай для тых, хто вырашаў яе лёс. Той,хто спрабаваў пашырыць такія рамкі, а гэта значыць прэтэндаваў на нешта, мог апынуцца за мяжой, у псіхушцы, у турме. Ім заставалася альбо маўчаць, альбо граць ролю дурня.

Гэта быў час, калі чалавечнасьць, розум, талент і сумленьне не гарантавалі чалавеку ні шчасьця, ні добрай пасады, ні багацьця. Гэта быў час пратэкцыі, апякунства і блату партыйнай наменклатуры, час падхалімаў, угоднікаў і бяздарных кіраўнікоў. Пасьля сябе яны пакінулі сабе падобных: такіх жа праставатых, абмежаваных і недалёкіх. І вось прыходзіць новае пакаленьне. Пакаленьне, якое распачало фармавацца пасьля перабудовы, у час галоснасьці, плюралізму, гутарак пра дэмакратыю і рынчную эканоміку. Але атрымала яно ў спадчыну тую ж ідэалогію, псіхалогію і сістэму, якую з гэтай нагоды так і ня здолее рэфармаваць.

Пасьля такіх папярэднікаў тут ня можа быць гутаркі пра маральны, культурны і інтэлектуальны яго ўзровень. Склалася сітуацыя, пры якой «сеяць разумнае, добрае, вечнае» стала ня выгадным. Пераацэнка чалавечых каштоўнасьцяў у людзкой сьвядомасьці адбываецца ў такім выпадку не на карысьць чалавека. Сьвет матэрыяльных рэчаў кіруе чалевекам.

А калі так, то значна выгадней гандляваць. А гандляваць можна ўсім: усім, што створана Богам, Чалавекам і Д'яблам. Духоўныя каштоўнасьці ігнараваліся не адным пакаленьнем. А для таго, каб штосьці прадаць як мага даражэй і купіць як мага танней, не дастаткова быць звычайным трансьлятарам інфармацыі, тут розум патрэбен. Прастата ўступае месца хітрасьці. Хітрасьць, дарэчы, ва ўсе часы мела выгоду, але разглядаць яе трэба не як прыдатак да розуму, а як праяву бяздарнасьці і несумленнасьці.

Прыйшоў іх час: час хітрых і несумленных. Страшныя гэтыя людзі. Страшныя сваімі чыста вузкімі асабістымі інтарэсамі. Для гэтых людзей нічога няма сьвятога ў дасягненьні сваіх мэтаў. Страшна робіцца ад хамства і д'ябальскай пустэчы ў вачах гэтых людзей. І падбіраюць, і твораць яны сабе падобных. Ці можа быць і на гэты раз наступнае пакаленьне лепшым?

Але ёсьць людзі, якія нараджаюцца і жывуць ня ў свой час. Звычайна яны становяцца ахвярамі таго ці іншага пакаленьня ўлады. Гэта разумныя, добрыя, сумленныя і вялікія ў сваёй духоўнасьці людзі... і няшчасныя гэтыя людзі. Лёс іх пакутніцкі і трагічны. Чаму так здараецца - варта задумацца. Але, хіба ж у свой час прыйшоў Хрыстос?! І наогул, што значыць «свой час»? Час кожнага тады, калі ён жыве. Ці быў бы патрэбен Хрыстос тады, калі б прыйшоў у іншы час!

ЯНКА ТРАЦЯК

АБ'ЯДНАЛІСЯ ПАЛЮБОЎНА

Напэўна, адным з першых у вобласьці страціў сваю «мэрыю» ціхі правінцыйны Шчучын. Дэпутаты гарадзкога Савету амаль аднадушна (пры трох устрымаўшыхся) «аддаліся» у састаў райсавету. Аб'яднаньне адміністрацыйных адзінак горада і раёна адбылося па прапанове старшыні раённага выканаўчага камітэту В.Казяка, які спасылаўся на адзін з атрыкулаў Закона РБ «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні ў Рэспубліцы Беларусь».

Дэпутаты раённага Савету на сваёй сесіі таксама далі згоду на аб'яднаньне.

Хто ад гэтага выйграў, пакуль невядома. На жыцьцё і дабрабыт шчучынцаў, якія ўжо амаль тры тыдні жывуць бяз мэра і мэрыі, пры «новай уладзе», гэта падзея пакуль ніяк не паўплывала. Паранейшаму брудныя і дрэнна асьветленыя вуліцы, жудасныя дарогі, паўпустыя крамы каапэратыўнага гандлю і... катастрафічны дэфіцыт сьметнікаў.

А там пажывем - пабачым...

А.ЗАСКАМКА.

ВАС КЛІЧА ЛІЦЭЙ

Кажуць, што Беларусь атрымала незалежнасьць, як дар лёсу, а не выпакутавала яе, як, напрыклад, Летува. Таму зараз і на бліжэйшыя часы найбольш вострая праблема - абарона незалежнасьці, якую заўсёды лягчэй атрымаць, чым адстаяць. І вось у гэтым велізарная роля нацыянальнай асьветы. Бо толькі з моманту абвяшчэньня незалежнасьці дзяржавы, яе народ пачынае пераўтварацца ў нацыю, якая - і толькі яна! - здольна ў сваю чаргу абараніць незалежнасьць сваёй дзяржавы. А як пераўтварыць народ Рэспублікі Беларусь, які складаюць шмат якія нацыянальнасьці, у адзіную нацыю? Толькі праз культуру, праз мову таго этнасу, які спрадвеку жыве тут, на зямлі Беларусі. Гэта значыць, праз беларускую культуру, праз беларускую мову, якія арганічна ўзьніклі і працягваюць сваё ня надта прыкметнае існаваньне на гэтай зямлі. Ня надта прыкметнае, але - уявіце на хвілінку, што раптам зьнікла «непрыкметнае» паветра...

А праз культуру і мову выпрацоўваецца і адпаведнае, уласьцівае менавіта гэтай зямлі мысьленьне, і чалавек адчувае сябе ўтульна і вольна, жыве паўнакроўным жыцьцём.

Як жа далучыцца да нацыянальнай культуры? Людзям сталага веку і сапраўды гэта ня проста. А дзецям і ўнукам нашым? Толькі праз прадуманую, дасканалую сістэму нацыянальнай асьветы.

І вось, пакуль сьпецыялісты распрацоўваюць адпаведныя канцэпцыі, у Менску пяць год існуе Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр (БГАКЦ), які сваю мадэль нацыянальнай асьветы рэалізуе праз беларускі гуманітарны ліцэй. У Горадні чацьвёрты год працуе філія БГАКЦ з адпаведнай навучальнай установай. Першы год гэта быў нядзельны беларускі ліцэй (на базе СШ N 11), другі і трэці год -стацыянарныя класы на базе СШ N 22. А зараз новы навучальны год пачынаецца ў СШ N 27, дзе ўлады прымаюць рашэньне стварыць гарадзкі ліцэй.

Пачынаючы з 8-га класа, навучэнцы, акрамя засваеньня праграмы базавай школы (усе прадметы выкладаюцца на беларускай мове), паглыбляюць свае веды, пашыраюць уласны сьветапогляд праз далучэньне да гісторыі і культуры роднага краю, знаёмства з сусьветнай культурай, міфалогіяй, рэлігіязнаўствам, асновамі філасофіі, паглыблена вывучаюць беларускую і замежныя (нямецкую ці ангельскую) мовы. Пры гэтым ствараюцца ўмовы для пазнаньня самога сябе, для самарэалізацыі, выпрацоўваецца здольнасьць падыходзіць да любога пытаньня сістэмна, разгледжваць любую зьяву рознабакова. Так, на інтэграваных уроках-дасьледаваньнях вывучалася «тэра інкогніта» Гарадзеншчыны - Мелавыя (Крэйдавыя) горы, параўноўваліся «Боская камедыя» Дантэ, «Мёртвыя душы» Гогаля і «Новая зямля» Коласа.

На ўроках беларускай і сусьветнай літаратуры вучні пішуць паэтычныя творы, казкі, паданьні, ствараюць ілюстрацыі да мастацкіх твораў. Вывучаючы гербы гарадоў Гарадзеншчыны, на падставе гістарычных зьвестак, тапанімічных, этымалагічных, фальклору, сімволікі геральдычных фігур, зрабілі спробу прачытаць гербы - справа, якая зроблена бадай што ўпершыню. Такім чынам, моладзь вучыцца на падставе здабытых ведаў ствараць новыя веды. І ўсё гэта пад кіраўніцтвам цікавых настаўнікаў, многія з якіх - выкладчыкі універсітэту.

21 жніўня будзе праводзіцца набор у 8-ы (перадліцэйны) беларускі гуманітарны клас. Жадаючым прапануецца напісаць твор (сачыненьне) на прыкладную тэму «Мая радзіма Беларусь» (трэба паказаць сваё веданьне беларускай літаратуры і валоданьне беларускай мовай), а таксама сумоўе (субяседаваньне) па гісторыі Беларусі. Для выдатнікаў дастаткова сумоўя-знаёмства.

Чакаем сваіх будучых навучэнцаў а 9-й гадзіне ў СШ N 27.

А.ГОСЬЦЕЎ.

АГЛЯДАЛЬНІК «ИЗВЕСТИЙ» СПАТКАЎСЯ З АЛЯКСАНДРАМ ЛУКАШЭНКАМ

На мінулым тыдні ў Менску знаходзіўся член Прэзідэнцкага Савету Барыса Ельцына Ота Лацiс. Спадар Лаціс прыехаў як аглядальнік газеты «Известия». Ён сустрэўся з галоўным дапаможцам Прэзідэнта Беларусі Уралам Латыпавым, міністрам замежных спраў Уладзімірам Сянько, Старшынёй праўленьня Нацыянальнага Банка Станіславам Багданкевічам, а таксама з апазіцыйнымі палітыкамі - кіраўніком Беларускага Народнага Фронту Зянонам Пазьняком, Старшынёй Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады Міколам Статкевічам, лідэрам Партыі народнай згоды Генадзем Карпенкам. Візіт сп.Лаціса выкліканы зьвесткамі, якія пранiклі ў прэсу, быццам А.Лукашэнка ў 1996 годзе зьбіраецца балатавацца на пасаду Прэзідэнта Расеі. Асабістая сустрэча О.Лаціса з А.Лукашэнкам намечана на 15 жніўня.

СЯРГЕЙ АНТОНЧЫК СПАДЗЯЕЦЦА НА ВЯРХОЎНЫ СУД

Вярхоўны Суд Беларусі спыніў дзейнасьць рашэньня Ленінскага нарсуда Менска аб прызнаньні вінаватым дэпутата Сяргея Антончыка ў абразе гонару і годнасьці кіраўніка справамі прэзідэнта Івана Ціцянкова. Нагадаем, што Ленінскі нарсуд задаволіў іск і абавязаў Антончыка выплаціць спадару Ціцянкову 200 млн. рублёў у якасьці кампенсацыі за маральныя страты. Гарадзкі суд таксама пакінуў бяз зьмен рашэньне раённага суда, і судовыя выканаўцы ўжо былі гатовыя канфіскаваць маёмасьць дэпутата, бо грашовыя даходы сп. Антончыка малыя. Яму, звычайнаму рабочаму завода, каб выплаціць кантрыбуцыю спадару Ціцянкову, прыйдзецца працаваць каля 200 гадоў.

Сяргей Антончык лічыць, што раённы і гарадзкі суды вынесьлі незаконнае рашэньне, бо ён выступаў па даручэньню Вярхоўнага Савету і ня можа быць прыцягнуты да судовай адказнасьці. «Зараз, я думаю, справядлівасьць пераможа, таму што маёй справай займаецца суддзя Вярхоўнага Суда Іван Мінец, чалавек прынцыповы і сумленны», - заявіў Сяргей Антончык.

Дарэчы, менавіта Іван Мінец старшынстваваў на працэсе па іску Зянона Пазьняка да Аляксандра Лукашэнкі і абавязаў прэзідэнта папрасіць прабачэньня перад лідэрам БНФ.

ШУКАЮЦЬ ПАРУШАЛЬНІКА СПАКОЮ

Ліёзьнінскім РАУС узбуджана крымінальная справа па факту вывешваньня ўначы з 26 на 27 ліпеня напярэдадні Дня Незалежнасьці Беларусі на саракаметровай трубе камбіната бытавога абслугоўваньня бел-чырвона-белага сьцяга. Супрацоўнікам міліцыі ўдалося зьняць адпячаткі пальцаў чалавека, які ўзьняў сьцяг на такой вышыні.

Як паведамілі ў Ліёзьнінскім РАУС, «кола падазраваемых звужаецца».

СІМ

НАЗАД, У «СЬВЕТЛУЮ БУДУЧЫНЮ»!

Хачу выказаць сваю думку аб тым, што нумар газеты «Пагоня» за 28 ліпеня - 3 жніўня лічу вельмі зьместоўным.

Удалыя загалоўкі: «Дзень залежнасьці», «Пакуль самі ня будзем гаспадарамі», «Улада ў нас дыктатарская».

І тым ня менш, я зьдзіўлены, што нідзе не падкрэсьлілі таго факту, што лукашэнкаўская міліцыя змагалася з тымі, хто ішоў на мітынг з бел-чырвона-белым сьцягам яшчэ задоўга да рэферэндума, 25 сакавіка 1995 года. Я быў у Менску на тым мітынгу, калі выступаў кандыдат у дэпутаты, у якога вырвалі бел-чырвона-белы сьцяг з рук, паламалі дрэўка, а самога сілаю зацягнулі ў міліцэйскі ўчастак для састаўленьня пратакола аб парушэньні парадку. І гэта адбылося за месяц і 20 дзён перад рэферэндумам.

Наша чырвоная міліцыя ўжо тады адчула адносіны першага прэзідэнта (толькі ці беларусаў?) да нацыянальнага сьцяга. Здымкі, на якіх былі адлюстраваны факты вырываньня бел-чырвона-белых сьцягоў з рук тых, хто ішоў у сквер Купалы на мітынг 25 сакавіка 1995 г. былі апублікаваны ў «ЛіМе» і на бачынках газеты «Свабода». Цікава, што чырвоныя сьцягі ніколі з рук камуністаў не вырываліся і не зьнішчаліся, а 25 сакавіка 1995 г. зьнішчаліся дзяржаўныя сьцягі ў руках прахожых.

І зараз гэты сьцяг яшчэ законны. Ва ўсякім выпадку, больш законны, чым чырвоны з сярпом і молатам - сьцяг СССР, які міліцыя паважае і ніколі не чапае. Бо Закон Вярхоўнага Савету аб дзяржаўнай сімволіцы галавенствуе (мае большую сілу) над любым Указам прэзідэнта. Бо прэзідэнт - гэта не заканадаўчая ўлада, а выканаўчая. І ён, прэзідэнт, ня можа адмяніць закон, у тым ліку і Закон аб дзяржаўнай сімволіцы, прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам лукашэнкаўская міліцыя парушае Закон аб дзяржаўнай сімволіцы ня першы раз за час прэзідэнцтва сп.Лукашэнкі. І пры гэтым ані разу за гэты час не парвала даўно незаконныя сьцягі так мілай сэрцу Лукашэнкі, але даўно неіснуючай дзяржавы, якой быў камуністычны СССР. Знак Пагоні дзейнічае на міліцыянтаў, як чырвоная шмата на быка, а ў дзень Перамогі сярод якіх партрэтаў ішоў па праспекту наш прэзідэнт? Але ніводзін партрэт Леніна ці Сталіна ня быў парушаны ў руках дэманстрантаў.

Мне здаецца, што гэтыя факты трэба падкрэсьліць, апісваючы падзеі на плошчы Незалежнасьці 27 ліпеня 1995 г., каб кожнаму чытачу «Пагоні» было відавочна, куды гэтая «каманда» разам з чырвонаю міліцыяй, вядуць нас, грамадзян усё ж незалежнай Беларусі.

Вельмі важна напамінаць нашым грамадзянам аб тым, што лукашэнкаўская міліцыя пачала змаганьне з законнымі дзяржаўнымі сімваламі яшчэ да рэферэндуму, ведаючы, што вынікі рэферэндуму будуць зробленыя такімі, як трэба «бацьку нацыі» (а ці нацыі? Мо толькі сабору «Белая Русь»?).

Аляксандр БАХАНЧЫК,
пеньсіянер.

РЭХА ПАДЗЕІ

НЕБЯСЬПЕЧНЫ ГРУЗ ПАЕХАЎ У СТАЛІЦУ

Нядаўна наша газета апублікавала артыкул «Штучны Чарнобыль у Шчучыне», дзе расказвалася пра Шчучынскі завод «Аўтапровад», які прыдбаў радыяцыйны лом медзі. Сёньня мы вяртаемся да гэтай тэмы, каб расказаць пра далейшы лёс небясьпечнага груза.

Крыху больш тыдня прычэп з радыяцыйнымі адкідамі пад аховай міліцыі знаходзіўся ў ангары на тэрыторыі вайсковай часткі. А 25 ліпеня небясьпечны груз адправіўся на сьпецпрадпрыемства радыяцыйных адкідаў у Менск для дэзактывацыі і пахаваньня.

Паколькі радыяцыйныя трубы плавіліся на інструментальна-механічным участку, там таксама выяўлены ачагі забруджваньня з цэнтрам на абсталяваньні - нажніцах. Паводле замераў сьпецыялістаў раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі (у далейшым ЦГЭ) радыякцыйны фон сягнуў 99 - 1.522 мкР/г.

Як паведаміла лекар-радыёлаг Шчучынскага ЦГЭ Людміла Дзяшкевіч, якая была непасрэднай удзельніцай гэтых падзей, на ўчастку праведзены дэзактывацыйныя работы. Адкіды дэзактывацыі (грунт, шчабёнка) пахаваны на мясцовым сьметніку на трохмятровай глыбіні. Радыяцыйны фон на паверхні зямлі знаходзіцца ў межах нормы: ад 9 да 17 мкР/г.

Пацярпелымі ад радыяцыі лічаць сябе 45 работнікаў завода. Гэта, у першую чаргу, загадчыца склада адкідаў, грузчыкі, рэзчыкі. 19 жніўня яны пройдуць абсьледаваньне ў сталічным інстытуце радыяцыйнай медыцыны.

На заводзе «Аўтапровад» уведзены пасады радыёлагаў, арганізаваны ўваходны кантроль лома медзі, закуплены дазіметрычныя прыборы.

Пракуратура працягвае праверку па справе. Як ні дзіўна, аўтамашына, на якой таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Баярд» прывозіла на завод радыяцыйны метал, аказалася чыстай. І яшчэ цікавы факт - таварна-транспартную накладную ТАА «Баярд» аформіў чалавек, які не знаходзіцца ў штаце таварыства. Дзіўна, ці не так?

Мяркуючы па ступені радыяцыйнай забруджанасьці медных трубаў - да 10 000 (!) мкР/г, іх, хутчэй за ўсё вывезьлі з Чарнобыльскай зоны. Дарэчы, адтуль у апошні час «цягнуць» усё, што дрэнна ляжыць. Мабыць, забруджаная зона дрэнна ахоўваецца? Мо ўлады рэспублікі лічаць, што яна ўжо не ўяўляе сабой сьмяротную небясьпеку для беларусаў?

Так ці інакш, але радыяцыйная пляма распаўзаецца. Невядома, хто наступны ад яе пацерпіць...

Ала БІБІКАВА

У БЯРОЗАЎЦЫ ЎВЯЛІ СВАЕ ГРОШЫ

Ужо які месяц рабочыя Бярозаўскага шклозаводу атрымліваюць заробную плату мясцовай «валютай» - шклом. Напачатку абмяняць «шкляныя» грошы на «зялёныя» ці «зайцы» было не так складана - попыт на вырабы мясцовай гуты вялікі ў Горадні, іншых беларускіх гарадах, ды суседніх Летуве і Польшчы.

Але з цягам часу рэалізоўваць тавар стала ўсё складаней, бо шкляныя «зьберажэньні» расьлі, а попыт бліжэйшых пакупнікоў быў задаволены. Каб зьезьдзіць у тую ж Расею, дзе шкло, напэўна, пайшло б, патрэбны вялікія грошы. Ды адкуль іх узяць? Ня будзем жа прадаваць тавар свайму суседу, у якога хата таксама перапоўненая натуральнай зарплатай. «Шклом не наясіся. Калі гэтак пойдзе далей - дык будзем патрабаваць прадаваць нам хлеб за «шкляную валюту», - з сумнай ироніяй кажуць гутнікі.

Між іншым, кіраўніцтва гуты заробную плату атрымоўвае грашыма...

Вінцук МАЛЬСКІ.

БЫЛЫ КІНАТЭАТР ПЕРАТВОРЫЦЦА Ў МЕТАЛАЛОМ

У пачатку васьмідзесятых у Цэнтральным гарадзкім парку культуры і адпачынку Горадні быў устаноўлены сьпісаны самалёт «ТУ-124».



Некаторы час на яго базе дзейнічаў сьпецыялізаваны кінатэатр для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту «Палёт». Але потым дэманстрацыя фільмаў у ім была спынена, і самалёт стаў безгаспадарным.

Некалькі сьпецыяльна створаных камісій спрабавалі знайсьці «ТУ-124» прымяненьне, вывучаліся прапановы надалей выкарыстоўваць яго для дэманстрацыі фільмаў, у якасьці кавярні, музея, атракцыёна, але па розных прычынах яны не былі прыняты. Гарвыканкам не знайшоў нічога іншага, як прыняць рашэньне аб яго ліквідацыі: самалёт папросту будзе ператвораны ў металалом. Ужо пачаліся работы па яго дэмантажу і, магчыма, у бліжэйшы час яны будуць завершаны. Мяркуецца, што на месцы самалёта будуць пасаджаны дрэвы і зроблена клумба.

А.ДУК.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

АДЗІН НА АДЗІН З ВАЎКОМ

Адшукаць дзеда Пятра было зусім проста, бо ў мікрараёне Скідаля, дзе ён жыве - ён найстарэйшы чалавек. Яму ўжо 96 гадоў.

- Вы пражылі 96 гадоў, а ці памятаеце цікавыя эпізоды з Вашага жыцьця? - пытаю Пятра Мікалаевіча.

- Іх было многа, але больш запомніўся адзін, як я сустрэўся ў лесе сам-насам з ваўком. Адбылося гэта напярэдадні сьвята Пятра і Паўла ў 1939 годзе. Жыў тады я на хутары вёскі Грабава, што ў Зэльвенскім раёне. З вёскі перасяліўся, але хаты яшчэ не адбудаваў, таму жыў у гумне. У цёплы летні дзень адправіўся я ў мястэчка Дзярэчын, што ў трох кіламетрах ад нас. Вырашыў свае справы і вяртаўся дахаты. Ішоў праз лес. Пінжак быў накінуты на плечы. І нечакана хтосьці схапіў мяне за плечы, зьдзёр пінжак. Падумаў, што хтосьці жартуе са знаёмых, але, калі абярнуўся, дык убачыў ваўка з разяўленай пашчаю, які зноў кінуўся на мяне. У гэты момант я яму ўсадзіў руку ў пашчу і схапіў за язык. Гэта атрымалася так машынальна, што я да гэтага часу не магу зразумець, як гэта атрымалася. І пачалася барацьба з ваўком. Я моцна трымаў яго за язык, калі мы валтузіліся на зямлі. Ён укусіць мяне ня мог, але кіпцюрамі моцна пашкодзіў мне твар, грудзі, жывот, ногі. Барацьба была цяжкай і працяглай. Але ўсё ж я змог галаву ваўка моцна прыціснуць да зямлі.

Нас заўважыў Валодзя Цыбуль, які пасьвіў кароў. Ён каменем аглушыў зьвера, а надасьпеўшы лясьнічы з дубальтоўкі дабіў. Доўга мне не маглі расчапіць руку, якая дзяржала язык. Яе быццам паралізавала. Пасьля гэтага мяне адправілі ў бальніцу мястэчка Галынка, дзе прыняў 40 ўколаў ад шаленства. Галаву воўка адправілі ў Вільню, дзе аналізавалі і прызналі, што воўк быў шалёны. Лекаваньне прайшло добра.

Працяглы час вяскоўцы мяне абыходзілі, баяліся, а калі накіроўваўся ў лес па справах, дык пускалі па вёсцы пагаласку, што Пятро ашалеў, ужо пабег у лес. З часам вяскоўцы супакоіліся. Тады абяцалі мяне ўзнагародзіць грашовай прэміяй, але пачалася другая сусьветная вайна і ўладам было не да мяне.

А як склалася далей жыцьцё Пятра Мікалаевіча? Працаваў на сваёй асабістай гаспадарцы, якая складалася з трох гектараў, а затым у калгасе да выхаду на пенсію. Цяпер у дзеда Пятра вялікая сям'я. У пяці дочак дзесяць унукаў і дванаццаць праўнукаў.

- Рады, што дажыў да гэтага часу, - гаворыць дзед Пятро, - можа, дасьць Бог, дажыву і да стагоддзя, хочацца.

Ільля БАРЫСАЎ

На здымку: П.М.ФЯДЗЕНЯ.

Фота аўтара

ФАЛЬШЫЎКІ «ЗАСЬВЯЦІЛСЯ» У «БЕЛАРУСІ»

Тройчы на працягу тыдня ў абменным пункце банка «Беларусь» па праспекту Я.Купалы ў Горадні рабіліся спробы абмяняць фальшывыя купюры.

У першы дзень жніўня няўстаноўленая жанчына прад'явіла для абмену падробленую банкноту вартасьцю 50 долараў ЗША. Такую ж купюру пажадала абмяняць 4жніўня жыхарка Горадні. Яна патлумачыла, што два дні таму набыла яе ў незнаёмага ля гэтага абменнага пункта. А 6 жніўня невядомы спрабаваў абмяняць фальшывую купюру вартасьцю адзін «зялёны».

ЛЕСАПІЛКА СТАЛА ПРЫВАТНАЙ

8 жніўня аддзел дзяржмаёмасьці і прыватызацыі Гарадзенскага гарвыканкаму правёў продаж лесапільнага цэха аб'яднаньня «Райаграпрамтэхніка», які знаходзіцца на станцыі Аўльс.

Прыняць удзел у ім пажадалі дзьве гарадзенскія фірмы.

Упаўнаважаная камісія ў складзе шасьці чалавек павінна была аддаць перавагу таму ўдзельніку конкурса, які прадставіць бізнес-план выкарыстаньня аб'екта; прапануе за яго самую высокую цану (пачатковая 665 мільёнаў 627 тысяч 600 рублёў); пагодзіцца захаваць профіль аб'екта і колькасьць працоўных месцаў на пяць гадоў, прытрымлівацца нормаў яго тэхнічнай эксплуатацыі і аказваць тэхнічную дапамогу «Райаграпрамтэхніцы».

Нездарма пераможцам было прызнана вытворча-камерцыйнае прадпрыемства «Факторынг-плюс». Яно абавязалася пасьля набыцьця ва ўласнасьць лесапільнага ўчастка захаваць колькасьць працоўных месцаў, але і перадаць бясплатна «Райаграпрамтэхніцы» ў якасьці тэхнічнай дапамогі лесапільны станок і паставіць «райсельканмунгасу» па цэнах ніжэй за рыначныя 500 тон вугля для забесьпячэньня бальніц і школ раёну. Акрамя таго, «Факторынг-плюс» прапанаваў за аб'ект 670,5 мільёнаў рублёў. А вытворча-камерцыйная фірма «Бурштын» у заяўцы для ўдзелу ў конкурсе ўказала, што зьбіраецца захаваць колькасьць працоўных месцаў і заплаціць за лесапільны ўчастак 667,5 мільёна рублёў.

ГАРЫМ!

Мінулы тыдзень стаў рэкордным па колькасьці зафіксаваных на Гарадзеншчыне пажараў: 65 разоў давялося выязджаць пажарным па выкліках.

Усё часьцей узьнікаюць пажары на жніве. Няспраўнасьць іскрагасільніка трактара «МТЗ» стала прычынай згараньня ячменю на плошчы 0,5 гектара ў калгасе «Сакольнікі» Сьвіслацкага раёну. А ў калгасе імя Мічурына Астравецкага раёну агонь зьнішчыў 20 тон салаты.

Працягваюць узьнікаць лясныя пажары. У Іўеўскім раёне ля вёскі Масткі такі пажар ліквідаваны на плошчы ў адзін гектар, а ў Мастоўскім раёне ля вёскі Навасёлкі - на плошчы паўгектара. Усяго за тыдзень лясныя пажары зафіксаваны на плошчы каля 6 гектараў.

Гараць і тарфянікі. Тарфяны пажар на плошчы 1,5 гектара ліквідаваны на Лідчыне. А на Слонімшчыне і Іўеўшчыне такія пажары былі зафіксаваны на плошчы ў чатыры і тры гектары.

А.ДУК

АЛЕНА ЛЯДОЎСКАЯ: «МАЯ ЗАПАВЕТНАЯ МАРА - ПРЫЕХАЦЬ З КАНЦЭРТАМ У ГОРАДНЮ!»

Крыўдна і балюча, калі таленавітыя людзі, атручаныя тутэйшай антыкультурнай атмасьферай, змушаныя пад ціскам зьнешніх абставін зьязджаць на Захад і шукаць лепшай долі. Праз нейкі час мы даведваемся, што дзякуючы цяжкай працы, напорыстасьці й мэтанакіраванасьці яны дамагаюцца прызнаньня й зьдзяйсьняюць запаветныя мары.

Зусім нядаўна я спаткаўся з джазавай піяністкай Аленай Лядоўскай, якая ўжо дзевяць месяцаў жыве ў Варшаве і працуе ў сусьветнавядомым джаз-клубе «АКВАРЫУМ». Яна прыехала на два тыдні ў Горадню, каб сустрэцца з сябрамі і атрымаць сьвежыя ўражаньні, пашпацыраваць, проста натхніцца.

- Алена, якім чынам ты апынулася ў Варшаве? Ці не шкада было пакідаць Беларусь?

- Вядома, ад'язджаць было шкада, але апошнім часам я ў Горадні пачувала сябе вельмі няўтульна. І гэта ня толькі чыста бытавыя праблемы, а хутчэй немагчымасьць рэалізавацца творча. Працяглы час я выкладала музыку. Спачатку ў Бераставіцкай музычнай школе, у Гарадзенскім музвучылішчы, вучыліўчы культуры. Тулілася па інтэрнатах, езьдзіла на месца працы і на канцэрты на грузавіках. Прыходзілася цягаць самой інструменты, займацца нейкімі арганізацыйнымі пытаньнямі, цярпець раўнадушша і зьдзеклівыя заўвагі чыноўнікаў ад культуры. Разумееш, у нас артыста ставяць у такія ўмовы, калі ён вымушаны адначасова і сьпяваць, і сьвятло ўключаць. Апошнім часам у Горадні я грала ў кафэ Дома афіцэраў. Мяне абуралі хамскія адносіны прысутных і афіцыянтаў. У дадатку мяне літаральна выпхнулі з інтэрната. І я на ўласныя страх і рызыку, ня маючы ніякіх сродкаў да існаваньня, паехала ў Варшаву...

- Звычайна, калі творчы чалавек апынаецца на Захадзе, ён спачатку займаецца чым заўгодна, толькі не любімай справай. Чым займалася ты, каб зарабіць на хлеб?

- Сапраўды, спачатку была адна праблема - не памерці з голаду. Калі маеш жаданьне зрабіць кар'еру, ты павінен прызвычайвацца да ўсяго. Эмігранту цяжка першы год. Трэба ж недзе жыць. Пісала музыку да дзіцячых сьпектакляў, давала прыватныя ўрокі. Дык вось знаёмыя, дзеля сьмеху, далі мне тэлефон джаз-клуба «АКВАРЫУМ», маўляў, патэлефануй, мо й атрымаеш якую прапанову. Да гэтага я ўжо наведвала бясплатныя канцэрты, сядзела ціхенька ў кутку і слухала, як граюць «зоркі». Нарэшце, наважылася патэлефанаваць мэнэджэру. Ён адразу прызначыў праслухоўваньне. Я ішла ў клуб і дрыжэла, баялася, што «забракуюць». А ўсё вырашылася за дзесяць хвілін. Мяне праслухаў знакаміты піяніст Богдан Холовня і адразу прапанаваў кантракт. Так што я вельмі ўдзячна ўсім гарадзенскім чыноўнікам ад культуры, што яны мяне «выпхнулі» з Горадні.

- Джаз-клуб «АКВАРЫУМ» - вядомае месца ня толькі ў Варшаве, але ў сьвеце. Туды прыязджаюць знакамітасьці сусьветнага ўзроўню. Як да цябе ставіцца кіраўніцтва клуба?

- Вельмі добра. Там няма розьніцы хто якой нацыянальнасьці ці хто якое займае месца ў сацыяльнай іерархіі. Галоўнае - талент і прафесійныя здольнасьці выкананьня. Няма таксама праблемаў з ганарарамі. Я граю канцэрт і апасьля адразу атрымліваю грошы. Хацелася б і надалей выступаць там. Я проста шчасьлівая, што маё імя друкуюць на афішах і ў газетах побач з Рэтам Мэтані, Андрэасам Валенвайдэрам, Джонам Скофілдам, Роні Віласам, Жозэфам Завінулам... Пра такое можна толькі марыць. Ня кожны аматар музыкі можа заплаціць за білет 100-150 доляраў, каб пабачыць і пачуць жыўцом «зорку»... Польшча, у адрозьненьне ад Беларусі, - джазавая краіна, увогуле краіна з вельмі высокай музычнай культурай. Там звычайнага савецкага чалавека адначасова зьдзіўляюць і кранаюць да глыбіні душы высокі прафесіяналізм і проста клапатлівыя адносіны да сваёй культуры. Гэта нейкая трапяткая сакральнасьць...

- А якія твае планы на будучыню?

- Мая запаветная мара - прыехаць з канцэртам у Горадню!

Гутарыў Людвік САРОКА

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

РАСЕЯ

МАСКВА

З абвінавачваньнем супрацоўнікаў амерыканскага пасольства ў шпіёнскай дзейнасьці выступіла газета «Сегодня». 4 жніўня ў «Сегодня» пад псеўданімам «Степан Дворников» апублікавалі артыкул «В Россию с любовью. ЦРУ начало работу с российским электоратом».

У артыкуле адлюстравана службовая дзейнасьць пяці амерыканскіх дыпламатаў на працягу апошніх двух гадоў. Аб крыніцах інфармацыі аўтар не паведамляе. У ліку пяці дыпламатаў упамінаўся першы сакратар пасольства ЗША і кіраўнік зьнешнепалітычнага аддзела пасольства Томас Грэхэм. Камэнтуючы абвінавачаньне газеты, ён паведаміў: «Мне здаецца, гэты артыкул накіраваны ня столькі супраць пасольства ЗША, колькі супраць некаторых расейскіх кіраўнікоў, тых кіраўнікоў, з якімі мы сустракаліся і якія названы ў артыкуле. Што датычыць мяне, то я ўжо дзесяць гадоў працую сакратаром пасольства ЗША, а не ў ЦРУ». Адказваючы на пытаньне, ці не зьбіраецеся Вы ці хтосьці з Вашых калег падаць у суд на аўтара і газету, спадар Грэхэм адзначыў: «Мы не зьбіраемся гэтага рабіць, у нас існуюць магчымасьці дзейнічаць па дыпламатычных каналах». «Я думаю, - адзначыў ён, - што наконт гэтага будзе зроблены дэмарш расейскаму ўраду».

* * *

У цяперашні час на тэрыторыі Расеі знаходзіцца 967 хворых на СНІД і ВІЧ-інфікаваных. Сярод іх 458 чалавек - іншаземцы. Аб гэтым паведаміла на прэс-канферэнцыі старшыня Камітэта па здароўю Дзяржаўнай Думы Расеі Б.Дзянісенка. Канферэнцыя праводзілася ў сувязі з падпісаньнем прэзідэнтам Расеі Закона аб СНІДзе.

Па словах Б.Дзянісенкі, вялікая колькасьць іншаземных грамадзян сярод захварэўных і вірусаносьбітаў тлумачыцца «адкрыцьцём межаў і пашырэньнем кантактаў з замежнымі краінамі». Іншыя прычыны павышэньня ўзроўню захворваемасьці СНІДам - нездавальняючае забесьпячэньне бальніц аднаразовымі шпрыцамі, а таксама «зьмяненьне сэксуальных паводзін моладзі». Закон прадугледжвае абавязковую праверку на ВІЧ-інфікаваньне донараў, а таксама замежных грамадзян на тэрыторыі іх краін, калі яны маюць намер наведаць Расею на срок больш 3-х месяцаў.

УКРАІНА

КІЕЎ

«Канстытуцыйны працэс на Украіне накіраваны на ўстанаўленьне такога дзяржаўнага ладу, які б поўнасьцю адпавядаў эўрапейскім нормам і фундаментальным правам і свабодам чалавека». Пра гэта гаворыцца ў лісьце прэзідэнта Украіны Л.Кучмы, старшыні ВС Украіны А.Мароза і прэм'ер-міністра Я.Марчука ў Савет Эўропы.

У сваім лісьце кіраўнікі украінскай дзяржавы просяць паскорыць працэс прыняцьця рэспублікі ў Савет. Кіраўніцтва рэспублікі прыклала да ліста адказы на 11 пытаньняў, пастаўленых Саветам Эўропы. Згодна гэтым адказам, новую Канстытуцыю Украіны прымуць да 8 чэрвеня 1996 года, а да канца бягучага года будуць прыняты новыя Крымінальны і Грамадзянскі кодэксы.

(Э.-Х.)

СЛОВА НЕ РАЗЫЙШЛОСЯ СА СПРАВАЙ

Адбылося пашыранае паседжаньне Думы Гарадзенскага аддзяленьня Рускага таварыства. Пачынаючы яго, старшыня Думы А.Волкаў падвёў вынікі праведзенай работы за паўтара месяцы з дня стварэньня аддзяленьня. За гэты час яно зарэгістравана ва ўпраўленьні юстыцыі аблвыканкаму, працягвалася распрацоўка праекта «Рускі дом друку». Сябры РТ прынялі ўдзел у сустрэчах з Патрыярхам Маскоўскім і Усяе Русі Алексіям II. Пры садзеяньні арганізацыі 7 гарадзкіх настаўнікаў у складзе беларускай дэлегацыі пабывалі ў Цьвярскім інстытуце ўдасканаленьня настаўнікаў, а 12 дзяцей з Горадні адпачылі ў санаторыі «Чырвоны бор», што на Смаленшчыне.

Затым адбыўся абмен прыязнасьцямі. Настаўнікі выказалі ўдзячнасьць Рускаму таварыству за магчымасьць «пабываць у казцы». Падчас знаходжаньня ў Цьвяры яны праслухалі цыкл лекцый па гісторыі і філалогіі, атрымалі бясплатна шмат дапаможнікаў і падручнікаў, пазнаёміліся з выкладчыкамі маскоўскага і цьвярскога універсітэтаў, зьдзейсьнілі шэраг экскурсій. Бацькі дзякавалі за тое, што іх дзеці змаглі адпачыць у адным з лепшых санаторыяў Смаленскай вобласьці і завялі шмат сяброў ня толькі з Расеі, але і з Украіны, Малдовы.

Намесьнік старшыні аддзяленьня А.Кацюк, выказаўшы прысутным ўдзячнасьць за веру ў Рускае таварыства, перайшоў да «персьпектываў». Наперадзе дастаўка на Гарадзеншчыну расейскай перыёдыкі і падпіска на яе па цэнах, ніжэйшых, чым у традыцыйных структур, і ў больш шырокім асартыменце. У Берасьці такая работа ўжо праведзена, і там людзі маюць магчымасьць атрымліваць перыядычныя выданьні з Расеі.

Як высьветлілася, Рускае таварыства, кіруючыся прынцыпамі «Калі ня мы, дык хто?» - узяло пад сваё крыло рок-гурт «Уяўныя людзі». А.Кацюк прадэманстраваў аўдыёкасету з яго альбомам і ўкладышам, у якім зьмешчана інфармацыя пра Рускае таварыства. Затым увазе прысутных было прапанавана некалькі песень у выкананьні ўдзельнікаў ансамбля. Мэнэджэр гурта І.Варабей паведаміў, што «Уяўныя людзі» вярнуліся з паездкі па Гарадзеншчыне і Віцебшчыне, падчас якой правялі шэраг дабрачынных канцэртаў. А ў пачатку верасьня з нагоды двухгадовага юбілея гурта ў Горадні адбудзецца шоў.

А.ДУК

УРАЧЫСТАЕ АБЫХОДЖАНЬНЕ 51-х УГОДКАЎ ДРУГОГА УСЕБЕЛАРУСКАГА КАНГРЭСУ Ў АЎСТРАЛІІ

У нядзелю, 2-га ліпеня 1995 г. Беларуская грамадзкасьць 4-х мільённага аўстралійскага горада Сыднэй афіцыйна адзначыла гістарычную падзею 2-га Усебеларускага Кангрэсу, які адбыўся, дзякуючы ахвярнай працы беларускіх патрыётаў, у Менску 27-га чэрвеня 1944 г.

Зьнішчыўшы незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі і ўтварыўшы на яе месцы Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку, маскоўскія чырвоныя імперыялісты з вялікай трывогай глядзелі на той вялікі нацыянальны ўздым беларускага народу, і на тое нацыянальнае адраджэньне, якое праводзілася пад кіраўніцтвам камуністычнага, але чыста беларускага - Ураду БССР...

Масква добра ведала, што гэтае нацыянальнае адраджэньне пагражае развалам расейскай імперыі і што беларускія дзеячы, нягледзячы на іхнюю прыналежнасьць да камуністычнай партыі, раней ці пазьней пачнуць дамагацца і змагацца за поўную незалежнасьць Беларусі, і ў 1929-м годзе Масква пусьціла ў ход свой першы антыбеларускі пагром, з тым трагічным вынікам, што ад 1929-га да 1939-га года больш за чатыры мільёны беларусаў былі або фізычна замардаваныя ў розных Курапатах маскоўскімі крывапійцамі і іхнімі беларускімі калабарантамі-здраднікамі, або вывезеныя на вечную катаргу і сьмерць у далёкія ад Беларусі часткі маскоўскай імперыі...

Пераважная бальшыня беларускай інтэлігенцыі, уключаючы тых, каторыя належалі да, ды нават ачольвалі камуністычную партыю Беларусі, былі зьнішчаныя, і Сталін у Маскве (таксама, як і Гітлер у Берліне хацеў зьнішчыць яўрэяў) думаў, што ён нарэшце і назаўсёды «развязал белорусский вопрос...».

Аднак, як аказалася (у чым нават і сам вораг пераканаўся), што лягчэй ворагу расстраляць нявінную беларускую сямейку, чым выбіць ідэю Незалежнасьці Беларусі з сэрцаў і розуму беларускага народу...

Параўнальна хутка, кроўныя - па дыктатарству і тэрору - браты, Сталін і Гітлер, пасварыліся паміж сабою, і ў чэрвені 1941-га году пачаўся наступ Гітлераўскай Нямеччыны на чырвоную маскоўскую імперыю і літаральна за некалькі дзён бальшыня тэрыторыі Беларусі была занятая нямецкай арміяй... Сітуацыя была вельмі скамплікаванай і небясьпечнай, аднак, застаўшыся пры жыцьці, патрыёты беларускага народу адразу прыступілі да аднаўленьня моцна разбуранага беларускага нацыянальнага жыцьця...

Прыхільнікі маскоўскага імперыялізму абвінавачваюць беларускіх патрыётаў ў «калабаранцтве» з немцамі і г.д. Аднак нават і вораг ведае, што патрыёты беларускага народу працавалі для дабра і нацыянальнага адраджэньня сваёй краіны, і вораг павінен таксама знаць, што сьвятым абавязкам кожнага паднявольнага народу было, ёсьць і заўсёды будзе выкарыстоўваць кожнага ворага і кожную нагоду, каб хаця часткова адбудаваць, падмацаваць нацыянальнае жыцьцё сваёй краіны. Тагачасныя беларускія нацыянальныя дзеячы добра гэта разумелі, калі яны, выкарыстоўваючы слабасьць немцаў, склікалі ў Менску, 27-га чэрвеня 1944 г. 2-гі Усебеларускі Кангрэс, вуснамі якога беларускі народ зацьвердзіў Абвешчаньне Незалежнасьці Беларусі Актам 25-га сакавіка 1918 года і заявіў усяму сьвету аб сваёй рашучасьці змагацца за Вольнасьць і Дзяржаўную Незалежнасьць аж да пераможнага канца...

Урачыстае Абыходжаньне пачалося а гадз. 10-й раніцы Службай у Праваслаўнай царкве ў прыгарадзе Гомбуш, дзе Айцец Ігар адслужыў малебен за Беларусь і яе народ, і а гадзіне 1-й дня пачалася афіцыйная Акадэмія ў Беларускім Клубе ў Фэйрфілдзе... Заля была перапоўненая прысутнымі беларусамі і іхнімі гасьцямі. Старшыня Клуба, Міхась Лужынскі адкрыў Акадэмію зьмястоўнай і патрыятычнай прамовай, а пасьля сп. С.Шаўцоў, удзельнік 2-га Усебеларускага Кангрэсу, зрабіў пашыраны даклад аб тых змагарных дарогах, па якіх праходзілі беларускія патрыёты ў тыя небясьпечныя часы. На заканчэньне ўсе прысутныя з пачуцьцём адсьпявалі Беларускі нацыянальны Гімн - «Мы выйдзем шчыльнымі радамі...».

Алесь АЛЕХНІК

ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ

НА 56-я УГОДКІ АНТЫПОЛЬСКАГА ПАЎСТАНЬНЯ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІМ ПАЛЕСЬСІ

Рэшткі Беларускай сялянска-работніцкай Грамады працягвалі сваю дзейнасьць і ў 1930-я гады, толькі ўжо нелегальна. Кіраўніцтва Грамады, як вядома, было зьнішчанае бальшавікамі ў СССР, ацалелі толькі адзінкі. Але ж у Заходняй Беларусі засталіся сотні шэраговых арганізатараў-грамадоўцаў, якія прайшлі праз турмы ды не складалі рук, а працягвалі змаганьне супраць акупанта.

На пачатку 1939 г. ў Баранавічах адбылася нелегальная канферэнцыя грамадоўцаў, на якую сабралася больш 20 чалавек. Сярод іх былі: Васіль Лукашык, Аляксей Васіленя, Юльян Саковіч, Юрка Стасевіч, Сяргей Сіняк (Хмара), Васіль Вір (Пінскі), Лявон Лунь, Агата Невядомская, Іван Тарасюк, Канстанчук, атаманы Якуб Харэўскі і Іван Перагуд ды інш. Канферэнцыя разглядала пытаньні міжнароднага становішча і рабіла ўстаноўкі далейшай дзейнасьці ў Польшчы. Апошняя прайграе, а таму трэба тварыць свае ценявыя формы беларускае ўлады, каб у адпаведны момант вайны абвесьціць сваю незалежную Заходне-Беларускую Рэспубліку. Гэта выратавала б Заходнюю Беларусь ад гітлераўскай акупацыі. У ценявы ўрад ЗБР планаваліся наступныя асобы: В.Вір - прэм'ер, Раман Скірмунт - міністр замежных спраў, А.Невядомская - міністр культуры, ксёндз Адам Станкевіч - міністр рэлігійных спраў, Ю.Стасевіч і інш. На камандзіра паўстанцкіх сілаў быў пакліканы У.Тарасюк, былы сябра ЦК КПБ.

Паўстаньне, што пачалося першага верасьня 1939 г., добра апісаў ягоны ўдзельнік П.Гарагляд, успаміны якога я прапаную чытачам «Пагоні». Зазначу толькі, што спачатку на сталіцу ЗБР планаваліся Баранавічы, але пазьней выбар паў на Пінск. Тарасюк загінуў 16 або 17 верасьня (камуністыя сфальсіфікавалі ня толькі ход паўстаньня, але й нават дату гібелі Тарасюка - зрабілі 23 верасьня!) й Галоўны Штаб паўстанцаў узначаліў ат.Харэўскі. Гэта ён 17 верасьня адмяніў штурм Пінска й адвёў частку аддзелаў у лясы, а пасьля даў загад разыйсьціся па дамах. Многія ўдзельнікі акцыі «Заходне-Беларуская Рэспубліка» пасьля ваявалі ў аддзелах Беларускае Народнае Партызанкі 1942-1946 гадоў (Ю.Стасевіч, Канстанчук, Я.Харэўскі, І.Перагуд ды інш.).

ЯН ВЕЖАН

ВОЙНЫ СПАРАДЖАЮЦЬ ІМПЕРЫІ

Паважаная рэдакцыя. Сваім сябрам на Украіну дасылаю «Пагоню», «Свабоду», «Глос з-над Нёмна».Наўзамен атрымліваю іх прагрэсіўныя выданьні. Нядаўна атрымаў газету «Гроно». Вельма спадабаўся мне артыкул пад назовам «З гісторыі суседзяў», дзе аўтар выкрывае сапраўднае аблічча расейскага імперыялізму. Думаю, што пазнаёміцца са зьместам артыкула будзе асабліва цікава усім тым, хто бачыць Беларусь незалежнай.

З мемарандума генерала Аляксея Курапаткіна цару Мікалаю II.

«Ваша Імператарская Вялікасьць, на працягу XVIII і XIX ст.ст. Расея правяла ў войнах 128 гадоў і толькі 72 гады былі мірныя. З 128 гадоў вайны толькі пяць прыпадаюць на абарончыя войны, усе астатнія - гэта захопніцкія паходы. Каб Імператарская Вялікасьць мела пэўнае ўяўленьне, пачну храналагічна.

XVIII ст. для Расеі азначаецца шэрагам ваенных заданьняў:

1.На Паўночным Захадзе доўжыць распачатыя царамі Іванам III і Іванам IV войны і адваяваць у Швецыі балтыйскае ўзьбярэжжа.

2. На Захадзе працягваць барацьбу цара Аляксея Міхайлавіча і захапіць у Рэчы Паспалітай Беларусь і Украіну.

3. На Поўдні ісьці шляхам, які вызначылі князі Сьвятаслаў і Алег, каб працягнуць межы аж да Чорнага мора. Разьяднаць Турэччыну і рыхтаваць глебу для далейшых udaраў.

4. На Паўднёвым Усходзе весьці надалей ваенныя захады Фёдара Іванавіча і Барыса Галунова, пераратварыць Каспійскае мора ва ўнутранае мора імперыі і цьвёрдаю нагою стаць на хрыбце Каўказа.

5. У Азіі пашырыць межы ў двух накірунках - гэта Туркменістан і ўзьбярэжжа Ціхага акіяну».

Для зьдзяйсьненьня гэтых стратэгічных заданьняў Расея ў XVIII стагоддзі правяла 19 войнаў: Паўночная вайна (1700-1721 г.г.), Прускі паход (1711 г.), выправа на Хіву (1717г.), Нізоўны (1722-1724 г.г.), вайна з Персіяй (1725-1733 г.г.), вайна з Рэччу Паспалітай (1733-1734 г.г.), паход на Рэйн (1735 г.), вайна з Турэччынай (1735-1739 г.г.), ваенная кампанія супраць Швецыі (1741-1748 г.г.), выправа кн. Рэпніна на Рэйн (1748 г.), вайна з Прусіяй (1756-1762 г.г.), вайна з Рэччу Паспалітай (1769-1772 г.г.), вайна з Турэччынай (1769-1774 і 1787-1791 г.г.), вайна са Швецыяй (1788-1790 г.г.), вайна з Рэччу Паспалітай (1794 г.), вайна з Персіяй (1796 г.), вайна з Францыяй (1798-1799 г.г.). Да гэтага неабходна дадаць унутраныя войны: паўстаньне Астраханскае (1705-1706 г.г.), Башкірскае (1707-1709 г.г.), Булавіна (1707-1708 г.г.), Пугачова (1773-1774 г.г.).

